Аднойчы Ціп, вясковае мышаня, запрасіў у госці Тапа, мышаня з гораду.
Яны сядзелі за сталом, елі простую ежу, пілі прахалодную ваду і размаўлялі.
Іх хвосцікі павольна рухаліся, падмятаючы падлогу.

Звонку даносіліся шамаценне ветрыку
і бзыканне кузурак.



Ціп трошкі падумаў і пагадзіўся.

Праз тры дні, раніцай, ён накіраваўся ў горад. Яго вусікі і хвосцік узрушана матляліся на вятры.

Калі Ціп прыехаў, ён знайшоў Тапа і запытаўся:

— А дзе ты жывеш?

— У мяне няма сталага жытла, — адказаў Тап. — Усе гэтыя дамы навокал — мой дом. Хадзем са мной!



— Лепей паесці ў якім-небудзь іншым месцы, — піскнуў Тап. — Гэтая ежа вельмі, вельмі небяспечная!
Ціп здзівіўся, але ж паслухаўся сябра і нават не дакрануўся да ежы.



У вялікім доме можна было б купацца ў басейне, поўным іскрыстай духмянай пены. А яшчэ плаваць у керамічных лодках ці скакаць па металічных караблях.
Але для мышанятаў усё гэта было пад забаронай.

